Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспацэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто нл захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 31 Студня 1915 г. № 4

# ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце.** Як і ўвесь апошні час, бітвы на гэтым фронце паміж расейцамі і аўстро-немцамі далей прыковываюць увагу усяго сьвету. Відаць, што змагаюцца два непамернай велічыны волаты не на жыцьцё, а на сьмерць, змагаюцца кожны за панаваньне с часам аднаго над адным. Прыгледаючыся к тым небывалым крывапраліўным бітвам, к тым незвычайным высілкам, на якіе кідаюцца у апошніе часы немцы і аўстрыякі прыходзіцца думаць, што бадай ўжо не за гарамі той дзень, каторы прынясе развязку гэтай вялікай трагэдіі чэлавечэства. Божымов і Болімов, што на левым беразі Віслы, крывавымі літэрамі будуць упісаны на вечные часы у летапісі вайны. Але як бачым з вестак, усе безаглядные намаганьня немцоў і аўстрыякоў на мейсцы распалажэньня расейскай арміі не прынясьлі ім вялікай карысьці.

Як і мінуўшы тыдзень, найкрывавейшые бітвы адбываліся у першых днях гэтаго тыдню на левым беразі Віслы на фронце *Божымов—Гумін—Воля Шыдловска—Тартак Болімовскі.* 21 студня змаганьня тут не спынялося пры над'звычайным згушчэньні нямецкаго войска. Каб прарваць расейскі фронт, немцы ўвялі ў бітву, на вучастку каля дзесяці вёрст, сем дывізій, падтрымліваных ста батарэямі. Расейская проці-атака пачалася ноччу на 21 студня, прычым на ўсім фронце завязаліся упорные бітвы на штыхі. Расейцам удалося заставіць непрыяцеля перайці к абароні. Каля Божымова узяты дзьве лініі нямецкіх траншэй. Ад Гуміна праціўнік аткінуты; пасьля вельмі заўзятых рукапашных схваток, расейскае войска ўварвалася ў сялібу Воля Шыдловска, ў каторай праціўнік дзержаўся 2 дні, і заўладало ёй. 22 студня змаганьне пры Бзуры і Равцы адбывалося з неслабеючай заўзятасьцяй. Расейскае войска перайшоўшы у наступленьне, перэбралося цераз Бзуру блізка яе уплыву і заўладало часткай непрыяцельскай пазыціі. Каля Божымова, Гуміна і Волі Шыдловскай расейскіе і нямецкіе атакі ідуць па чародзі, падтрымліваные безупынным гарматнім агнём. 23 студня на гэтым фронце не спыняецца сільны гарматні агонь. Ня гледзючы на нямецкіе проці-атакі, расейскае войска ня толькі утрымалося на левым беразі Бзуры, але, і пашырыло далейшае наступаньне. У районі Божымова праціўнік кідаўся тры разы у безкарысные для сябе атакі. Далей ідзе тут толькі гарматняя перастрэлка і немцы так не напіраюць. Ужо 24 студня высьнілося, што проба праціўніка прарваць расейскі фронт ў районі Божымов—Воля Шыдловска прыпынена. 25 студня расейцы не спынялі наступаньня ў районі дольнай Бзуры, і раніцай, гэтаго-ж дня, перашоўшы тры рады драцяных загародоў, заўладалі сільным пунктам праціўніка.

На правым беразі Віслы на *Млаускім* напрамку большые стычкі адбываліся каля вёскі Надрож, Оршулев, Подлесьсе, Грондостары, асабліва на дарозі с Серпеца к Рыпіну. 25 студня бітвы ў районі *Сэрпец* прынялі болей заўзяты характар. 26 студня Штаб паведамляе, што немцы час за часам награмаджываючыся у Ўсходняй Прусіі і падцягнуўшы сьвежые сілы, у працягу апошніх дзён адбывалі усіленные разведкі і 25 студня перайшлі ў наступленьне значнымі сіламі на вучастку ад *Хожэле* да *Іоганінзбургу.* Адначасьне немцы пачалі рухацца на абадвух крылах усходне-пруськаго фронту: ў районе *Лаздэнена,* гдзе пры адбіцьці нямецкай атакі расейцам удалося іадзін з атакоўаўшых батальёноў знiстожыць амаль зусім, і на шляхах ад *Рыпіна,* гдзе расейская конніца сьцягнулася к Сэрпцу.

Поруч з гэтымі змаганьнямі у Польшчы, не спыняліея змаганьня і ў **Галіччыні.** Тутака крывапраліўнасьць бітвоў не уступае бітвам каля Божымова. Самае сур'ёзнае змаганьне вялося за перэвалы Карпат. 20 студня прыкмечэна тут немалые сілы немцоў і ўжо бітвы прыймалі усё болей і болей заўзяты характар. Вытрымаўшы на перэвалах *Тухолкі* і *Баскід* да дзесяці атак на штыхі і завершыўшы іх проці-ударамі, расейцы 21 студня пастанавілі адвясьці сваё войска з гэтых перэвалоў на прыгатаваные заўчасу пазыціі. Штаб паясьняе, штo наступаючые тут сілы вельмі немалые. Аднак 22 студня расейцы прадаўжаюць стрымліваць націск гэтых немалых сіл і ужо 23 наступленьне гэта стрымалі ды прымусілі праціўніка к атступленьню. 24 студня бітвы на Карпатах не спыняюцца на ўсім фронце. Расейскае войска зламала супраціўленьня праціўніка на трох умацованых пазыціях каля *Мезалаборч.* Так сама к поўначы ад перэвала Ужок каля *Лютовіско* праціўнік змушэны быў атступіць. На шляхах к *Надворнай* і к *Буковіне* расейскае войска, стрымліваючы наступленьне значных сіл непрыяцеля на трудна даступных горных пазыціях, паволі адцягіваецца назад. 25 студня наступаньне расейцоў у Карпатах не спыняецца. Перайшоўшые перэвал Тухолку цямецкіе калонны (атрады) кідаліся у гэты дзень 22 разы у страшэнна заўзятые атакі на занятые расейцамі высоты у районі *Козювкі.* Пад крыжавым расейскім агнём два разы праціўнік захопліваў адну з высот, але проці-атакай расейскай пехоты пасьля доўгай безпрымернай бітвы на штыхі быў з яе скінуты. 26 студня змаганьне на Карпатах у районі між Бартфельдам і Свіднікам не спыняецца. 27 студня расейскае войска на Дуклінскім, Лупкоўскім і Ужокскім напрамках, напіраючы нэ праціўніка, не перэстаюць пасовывацца наперад. Як і заўсёды, расейцы у бітвах у Галіччыні забіраюць шмат цалонных і рознай ваеннай здабычы.

**На Каўказкім фронце і на Заходнім фронце** палажэньне без перамен.

**На Чорным моры.** 24 студня турэцкі крэйсер «Брэслаў», падыйшоўшы к Батуму, выпусьціў 20 безрэзультатных выстрэлоў у расейскіе мінаноскі. Пасьля двух выстрэлоў с крэпасьці, «Брэслаў» аддаліўся. Расейскіе мінаноскі абстрэлівалі Хопу. 26 студня крэйсер «Брэслаў» абстрэліваў Ялту. Расейскіе крэйсеры абстрэлялі турэцкую батарэю каля Трапезунду і затапілі там нагружэны параход. Другіе два караблі с провіянтам расейцы затапілі каля Іероса.

## На вайне і каля вайны.

**Божымов і Болімов.** У вестках штабу Верхоўнаго Глаўнокамандуючаго у апошніе часы часта упамінаюцца названьня Божымов і Болімов, гдзе цяперака адбываюцца найкрывавейшые бітвы. Дзеля гэтаго вось ня лішне будзе даведацца, дзе гэтые мейсцы знайходзюцца.

Божымов—мястэчка келецкай губэрні, стопніцкаго павету. Непадалёк ад яго знайходзіцца вёска Божымовка, гдзе цяперака адбываюцца бітвы. Божымовка мае ўся 20 дымоў і належыць да памешчыка Творовскаго. Пераходзючы з рук у рукі, Божымовка разам с панскім домам зусім знішчожэна стрэлянінай расейскіх і нямецкіх гармат. Болімов – вялікі двор у ловіцкім павеці, належыць да гр. Собанскаго.

**Жудасьці вайны.** Калі японскіе маракі у часе асады Порт-Артура ішлі з усьмешкай на загубу, ўступаючы на паклад брандэроў — ўвесь сьвет і ў тым ліку ўся Расея аддала ім належачую пашану. Геройство, выказанае нават самым благім ворагам, варта прызнаньня, хаця-бы абставіны, у якіх гэто гэройство выявілося, напоўнялі жудасьцяй. Такой жудасьцяй напоўняюць душу спосабы, якіе ужываіць аўстра-нямецкае войска у Карпацкіх гарах, гдзе цяперака ідзець генеральная бітва: з мэтай пашкодзіць расейцам чым болей, яны ідуць на самаахвяру, на праўдзівую сьмерць. Гэта кашмар і аб гэтым страшна думаць і яшчэ болей пісаць.

Ідзець бітва. З гары спускаюцца цэлые рады непрыяцельскаго войска. Рады стройные, у акуратнай абмундыроўцы, адзін ад аднаго на 2—2 с паловай аршына аддалены. Глядзіш у пад'зорную трубу: німа гармат. І раптам, німа ведама скуль, у самы разгар бітвы пакаызваюцца кулемёты, якіе робюць сваю руйнуючую работу. Удалося пасьля шмат такіх «неспадзевак» прыкмеціць, што аўстра-немцы устанаўліваюць гарматы паміж першым і другім радам сваіх-жэ салдат. Гарматы невялікіе прыладжэные для гэтай мэты, і непрыяцельскіе салдаты сваімі плечамі, закрываюць гармату ці кулямёт ад вачэй расейскіх салдат. Афіцэр, хамандуючый кулямётам, паўзець па зямлі. Але ўся жудасьць у тым, што пярэдніе салдаты, за плечамі каторых хаваецца арудзіе, ідуць на праўдзівую загубу. Бо якбы ні стараліся салдаты пярэдніх радоў разбегчыся на бакі, пачуўшы грымоты арудзій, некалькі салдат павінны згінуць, дзеля таго што сіла арудзій, абхопліваець у паветры такі круг, што першымі павіны пацярпець бліска стоючые салдаты. Узятые у палон аўстрыякі у Карпацкіх горах пацьверджаюць ўсе гэта і апісывалі ўсю жудасьць тых салдат, якіх ставюць у першых радох. Але найболей сумная доля тых салдат, якіх ставюць у цэнтры. Вельмі рэдка каму удаецца выратавацца... Гэта адна с тых жудасьцей, каторые нясець с сабою вайна. Але калі удумаешся у тое, што павінны чуць салдаты выпаўняючые гэтае заданьне, то трудна не бачыць у апошнім вышэйшай праявы ваеннай адвагі: самаахвяры.

**Набоі у Нямеччыне.** Нямецкіе заводы у апошнім часе выраблююць каля трох мільёноў набояў што месяц, а ў будучыні яны змогуць рабіць шмат меней, с прычыны недастатку у Нямеччыне медзі і іншых мэталяў.

**Захват хлебных прадуктоў.** Як паведамляюць адэскіе экспортэры, з мамэнта закрыцьця Дарданелоў у рукі турак папала да 2-х мільёноў пудоў хлеба, захопленнаго на загранічных, болей ўсяго англіцкіх караблёх.

**Дэмонстрація проціў вайны.** У Жэневу тэлеграфуюць, што у Пільзэні (у Нямеччыні) былі шумные дэмонстраціі проці вайны. Паліціі з вялікім трудом удалося разагнаць таўпу дэмонстрантоў, арыштовываючы пры гэтым некалькі чэлавек.

**У Азэрбэйджане.** К мамэнту адходу расейскаго войска з Азэрбэйджана амаль ва ўсіх гарадох гэтай правінціі былі выкрыты змовы, арганізаваные проціў расейцоў пры помачы турэцко-нямецкіх агентоў. Перш за ўсё ўсе пэрсідзкіе курды перайшлі на старану туркоў. Нават курды Семко, заўсёды быўшые на старане расейцоў вялі сябе болей чым двузначна. Перастрэлку у Хоі, пазбавіўшую жыцьця двух расейскіх казакоў і аднаго дабравольца армяніна, выклікалі толькі яны. У Соуджбулаку, у Маразі, у Таўрызі, у Урміі туркі пачалі грабежствы і ўбіўствы пры помачы курдоў. Не пасьпелі расейцы выйсьці з Урміі, і у гэты момэнт, калі курды яшчэ не ўвайшлі туды, непрыхільнікі расейцоў павесілі дзевяць хрысьціян памагаючых расейцам.

## Боль старонкі мае.

Ёсьць на сэрцы ў мяне горэ,
Ёсьць цяжкая боль адна;
Ў сэрцы кожнаго гаворэ
Крыўдай горкаю яна.
Ў кожнай душацы жывучай,
Ў кожным дрэўку, у траве,
Ці у кветцы, ці ў плывучай
Рэчцы чуем мы яе...

Ветрык вее на раздольлі;
Ветрык песьні знаць пяе.
Не! — То голас нашай долі,
Вецер к небу падае!
——Забяры ты, ветрык, к Богу
Аж да неба крыўду ўсю:
Гэту долю, гэто горэ,
Болесьць цяжкую маю...
— Вырві с сэрца, вырві с цела,
Выймлі з рэчкі аж са дна,
Выймлі с кветкі,—каб ня мела
Тут прытулачку яна...
Ты не знаеш, ветрык вольны,
Гэтай болі што ў вамне?
Болі Нашай..
— Краю Родны!
Ветрык слухае мане!..

Прыслухаўся прытаіўшысь
Ветрык розсказкі маей
І... за гаем апыніўшысь,
Сьціхнуў с песенькай сваей...

**І. Піліпоў.**

* * *

Можэ быць родны бацька
Пятлю мне надзеніць,
Можэ быць родна маці
Мне ката заменіць.
Можэ быць родна хата
Мне стане магілай,
Мяне хутка забудзе
Дзяўчыненька міла...
Без малітваў, без плачу
Засыпюць зямлёю...
І адно дуб ў час бурны
Кіўне галіною...
Адно птушкі вясною
Пачнуць весяліцца,
Залатые прамені
Пачнуць мігаціцца.
Зоркі ясные з неба
Зірнуць а поўночы,
А з людзей тоніводны
Прыйсьці не захочэ...

**Ясакар.**

## Ліст да Бацькоўшчыны.

Не шукай ты шчасьця, долі
На чужым, далёкім полі...
*Янка Купала.*

Даўно я маніўся пазнаёміць вас з жыцьцём і прыродай гэтай суровай краіны, у каторую наша непрыхільная сучаснасьць выкідае сотні тысяч людзей амаль на галодную сьмерць: будзь гэта загнаны па суду пасюльга, будзь заблукаўшыйся у шуканьні долі-шчасьця работнік-самаход, ці пераселенец-хлебароб, пакінуўшый бацькоўшчыну у цьвёрдай надзеі знайсьці тут аздобны бохан хлеба,—ды ня меў я на гэта ні часу, ні змогі каб здолець жорсткі матэр'ял маіх непакорных думак выказаць у гучных словах нашай зычнай мовы. Дык выбачайце, калі я раскажу не так, або ня тое, аб чым-бы вы жадалі пачуць, бо сам я так рупна мо і не пісаў-бы,

## Таварыш мой...

Ідзе за мною ў сьлед касьцісты, бледны труп,—
Як цень — за мной, пры мне, куды я не ступлю;
Ці я устану, ці ў пасьцелі мёртва сплю—
Са мной заўсёды ён, заўсёды гэты жывы слуп!

Вакруг мяне пабудаваў жалезны зруб,
Ператварыў ў турму бязмежную зямлю,
Садраў чуцьцё—ці я цярплю, ці не цярплю,
Здушыў вужача грудзі ў сто сталёвых шруб,

Таварыш шчыры мой, люблю, люблю цябе!
Ні час, ні чэлавеча злосьць цябе ня зьесьць..
Ты пасланец мой, ты—сама аб шчасьці весьць!

Цябе, мой труп, я ў сьне і ў явы барацьбе
Ня кіну, як ня кінеш ты мяне ў жальбе...
О чэсьць табе, маё ты Адзіноцтво, чэсьць!..

**Янка Купала.**

20/I—15 г.

## КАЗКІ ЖЫЦЬЦЯ.

### Чыя праўда?

Дубэ шумелі аголенымі лапамі. Гэтым шумам-гулам спатыкалі яны кожную вясну. І была у гэтым шуме радасьць паноўленаго жыцьця; але чулася у ім калі-не-калі і нейкая глухая, стрыманая трывога. Толькі-ж трывога гэта не пакідала глыбокаго сьледу на твары магутных выхаванцоў вякоў. А кожны новы дзень вясны, кожны погляд сонца дадавалі столькі дабраты, столькі хараства, што не хацелася і ў думках мець гэту неясную трывогу. Падыханьне цёплаго веснавога ветрыка у маладзенькіх дубовых лісточках, яго вясёлая гутарка з імі рабіла дубэ нават шчасьлівымі.

Сярод гэтых дубоў быў адзін, што стаяў на вотшыбі, на берэзі рэчкі. Высока паднятая, лысая галава яго, бязмерна тоўсты жэралісты камень казалі за тое, што гэты дуб многа пажыў на сьвеці. Адзінота і тая шыр, што разлеглася вакруг, зрабілі гэты дуб разважнейшым спаміж усіх тутэйшых дубоў. І тагды, калі дубэ пераставалі думаць аб нягодах іх долі, гэты дуб заставаўся сур'ёзным і не паддаваўся парываньню маладой радасьці.

— Слухайце, што я скажу вам хлопцы дубэ! — пачаў раз гэты мудры дуб: — вот вы прыціхлі, заплакаліся, і шчасьлівые мары зрабілі вас якбы дзяцьмі... Што-ж, я хацеў-бы, каб ваша радасьць ня мела канца, і нехай бы ваша доля была яшчэ шчаслівейша; толькі ж я мушу сказаць вам, што ня место быць радасьці там, дзе узняліся касьцяные рукі неадваротнай сьмерці.

Апошніе словы старого прагучалі жудою. І як ня ішлі яны да таго, што было навакола!

А навакола было так згодна і хараша і радасна, — ўсё роўно як земля святкавала вялікае сьвято. Стары лес, што стаяў за рэчкаю, пазіраў важна і лагодна, бы гаспадар на багаты узрост сваіх ніваў. Вада ужо збегла з лугоў, і зарастаў іх зялёны кожушок маладой травінкі, і пахнуў гэты луг раджайнаю сыросцяй. На гэты бок рэчкі ішлі прыгожые скаты жоўтых узгоркоў, на каторых цямнелі маладые купчастые хвойкі, вясёлые і прыветные. Над імі снавала лесовая жаваранка, і песьня яе разлівалася срэбрам у сініх бяздонных хвалях Божых сьцяпоў. У небі там і сям вынікалі пазалачоные клубочкі харошэнькіх хмурынак, і згодна звісалі яны, сьветлые веснавые мары, над шырокімі палямі, над лугам, што разлёгся по абадвых берэгох рэчкі і бег далёка-далёка ў закрытую сіневатай смугаю даль... Было хорашэ, добрэ, так хорашэ і добрэ, што дубом прыкра было слухаць злавешчу гаворку старога дуба.

— Што ты прараккуеш, бацька-дуб? — сказаў высокі дуб з разложным верхам: нашы ліхіе часы прайшлі: мінулася зіма з марозамі, на сівер пашлі холадэ, зьбегла паводка, зноў сонцэ, радасьць, жыцьцё. Прыслухайся ты, што робіцца вакруг, на сябе самаго азірніся: унь бусел апраўляе гняздо на тваіх старэчых плечах, гняздо, каторае ты трымаеш з давёндаўно; а колькі у ім птацтва рознаго! І усе радуюцца, жывуць і аб сьмерці не дбаюць. А мы хіба сіроты у Бога, ці радасьці нам Бог пашкадуе, што мы павінны сумаваць—думаць аб сьмерці?.. Не, не праўдзіва твая гутарка!

— Не праўдзіва, не праўдзіва! — Загулі разам дубэ:—ты стары, сілы у цябе німа і табе зайздрасна пазіраць на тых, каму весела, хто жыць хочэ.

— На ім ужо і жалудэ не растуць,—сказаў сьмяючыся бліжшы сусед мудраго дуба.

—Лепш зусім ня мець жалудоў, чым мець іх дзеля свіной уцехі,—атказаў ён: — а я ўсё-ж такі хачу перэсьцярагчы вас. Ужо колькі гадоў кажу вам аб гэтым, але вы ня слухаеце Ну, што-ж? тым горэй будзе для вас, тым цяжэй будзе зірнуць ў твар нешчасьця.

— Ну, і натура у цябе, бацька—дуб! от як уляпаў у адно і тое, то мелеш і мелеш, і губа табе ніколі не зачыняецца. С кім не бывае бяды! От мы стаімо тут, а заўтра можэ загрымець гром, лясьне пярун, і німа нас! Можэ бура вывярнуць нас з долу... Ці мала якіе могуць быць выпадкі? Што варажыць аб тым?

калі-б мяне вы не прасілі: «прапішы Янучок, прапішы, як там жывуць людцы!» Ну-дык слухайце, ужо раскажу, як магу, калі вас гэта старонка натта цікавіць.

Першае, што мне кінулося тут у вочы, гэта лясы і горы, а далей я перэстаў прыкмечаць і гэта, бо апрыч гор і лясоў болей нічога не бачыш. Хоць-бы ты йшоў тыдзень, месяц, ці болей—усюды перад табой, за табой і абапал цябе цягнуцца безканечнай сьцяной сініе лясы і высокіе ледзяные горы. У разшчэлінах гэтых гор, як на дне пропасьці, с шумам і плескам вадаспадоў бурчаць, стугнуць і выкручываюцца ручайкі і рэкі. Па берагох гэтых рэк на не вялікіх прагалінах вялікай тайгі. дзе-ня-дзе без ніякаго парадку, комам і ломам параскіданы вёскі і засьценкі. Калі праходзіш праз гэтые вёскі, засьценкі і пушчы лясоў, цябе абхоплівае нейкае жудаснае ўражэньня бязжыцьцёвай пустаты і магільнаго спакою. Не ўбачыш тут ні магутнаго старога дуба, ні ліпы кучыстай, ні зялёных прысад і садоў, а толькі і відзіш кедроўнік, ці піхту ды незграбны, цыбаты лісьцьвяк. Птушак бадай зусім німа, бо ў лесі ціхутка, як ў склепі. Па вёсках ні бачна мужчын і кабет, пасеўшых для рады на прызбах ля хат. Не пацешыць тваё сэрцэ і моладзі круг абняўшэйся у танцах пад згукі іскрыпкі. І не лаві ты чулым вухам сьпевы гучные дзеўчат, — тут жуюць яны серу, як жвачку карэвы, а хлопцы й мужчыны гуляюць у карты, ці сьпяць нават у гарачую пару.

Не вясёлая, безгалосная і не паэтычная гэта старонка! Наш беларус, сын квяцістых палёў і кучыстых бароў і гаеў, дзе гудзяць роем пчолы і шчабечуць без удзержу птушкі, беларус, гаспадар не вялічкіх, але спавітых садамі і прысадамі вёсак, дзе усей вёскай селяне спаўняюць талокі, ігрышчы, ці тлумачуць грамадзкіе справы, і дзе любяць еднацца, куміцца,—тутка наш беларус у гэтым ледзяным царстве замкнутаго самалюбства, не спаткаўшы радзімых з'яў, зачахне ат тугі па роднай краіні, як нявольнік замкнуты ў вастрозі.

Па самай прыродзі ужо так злажыліся тут жыцьцёвые варункі, што прымушаюць чэлавека замкнуцца ў сабе: гэтак, высокіе горы-сьцены, якбы супыняюць уз мах свабоднаго палёту творчай мысьлі, ліхое бездарожжэ путае ногі парывам к грамадзкай дзеячнасьці, а рэдка раскіданые насяленьні забіваюць у людзях жаданьне супольнасьці і с корэнем вырываюць чэлавечае пачуцьцё к другой асобе. Вось так і жывуць яны самонадзейные і спакойные, загарнуўшыся у сябе, як рагач у лупіну.

Але ты не сібірак, ты ня зможэш гадзінамі сядзець на гопчыку (пяколак) і пыкаць люльку, цябе пацягне к людзям. Калі-ж захочэш праехацца да суседа на калёсах, каб аж пыл курэў, як гэта часам ты рабіў дома, на Беларусі, то ня думай, што табе гэта так лёгка удасца. Але садзіся вярхом на кані і гоцай праз круцізны гор, праз рэчкі і вываращіны таўстушчых дзерэў, ці шастом паганяй свой човен па бушуючых хвалях. Такім вось манерам прыходзіцца пірабірацца на палевые і сенакосные работы, каторые найчасьцей усе на востравох рэк. Так што човен пры гаспадарцы тутэйшаго селяніна з'яўляецца першай патрэбай. Само-сабой, што першабытны спосаб пераправы замінае селянам зліцца з болей культурнымі акраінамі і змушае іх быць экономічна залежнымі ад мейсцовых «князькоў». Воляй-няволяй тутэйшым селянам прыходзіцца прадукты сваей працы збываць за палавіну вартасьці «князьку» і ў тры-дорага яму-ж перэплачываць за рэчы першай патрэбы, што, канешна, ня можэ дабратворна адбіцца на узросьці селянскай гаспадаркі. Апрыч гэтаго яшчэ іх прагавітая пагоня за лёгкай нажывай, як палеваньне на дзіч, каторая бадай зусім вывелася, або няўмела узятые, у князькоў падрады і інш. яшчэ болей адыймаюць часу і сілы, што з большай вартасьцяй можна было-б выкарыстаць на абработку зямлі.

Будынкі як і ўся гаспадарка залішне сьведчуць аб нідастачы ахвочых рук. С паміж раскіданай будоўлі одзінокіе, як кол хаты, часта без стрэх, пазіраюць на цябе нейкім жудасным вокам разбітых акон, як тая асуджэная на ўбой жывёла, згубіўшая надзею на літасьць свайго гаспадара. Сялібы без абгароды і варот. Дварышчы і вуліцы заваленые дровамі і сьмяцьцём ніколі не прыбіраюцца і не мятуцца. Паглядзіш на гэты абы-як злепляны будынак, на абы-як працярэбляные поле і сенажаці і здаецца, што гэта зроблена тут так-сабе, да часу; а там калісь настане дзень і атчынюцца дзьверы здольнаго жыцьця; загнаные сюды нудой і няволяй людзі заварушуцца, пакінуўшы дачэсную гаспадарку. Я кажу так, бо не бачу у асновах цяперашняй мейсцовай гаспадаркі таго, што завецца жывучым, не бачу глыбокіх карэнёў мейсцовай культуры.

А калі заглянім у нутро хаты, то гэтта мы убачым ужо жаданьне устроіцца на местачковы лад: столь і сьцены пабелены вапнай, падлога, сталы, перэгародка і інш. малеваные, а часта-густа убачыш сталы, засланые настольнікамі, а падлогу самадзелковымі дыванамі, у бяднейшых—саломай. Ні палоў ні ложак тут німа, а сьпяць усе на падлозі падкінуўшы вайлак ці ласёву скуру.

Апратка лёгкая, не па клімату, — нават у 40° мароз чалдон едзе у лес, ці па сена у двух рэшманках (сермягах) і чыркох (скураные лапці), бо авечак хаваюць мала, толькі на вязёнкі, а каб пашыць кажух ці зьбіць валёнкі, дык мо' у заможнаго іх столькі і атшукаіш.

Бялізна болей крамная, бо ляноў ня сеюць ды і ня ўмеюць ткапь.

Што датычэ ежы, дык яна ужо зусім дрэнная: хлеб ячны, пячоные яблычкі (бульба) і заместа стравы заўсёды чай. Рады-ў-гады варуць скаромнае і то толькі тады, калі здарыцца звабіць у копку зайца, застрэліць глушца ці інш., бо сьвіней амаль не гадуюць. «За тое — хваляцца тутэйшые жыхары—раней мы паедалі мяска, калі дзічы было гэтулькі, сколькі і кустоў... Ня трэ' было і стрэльбы,—хоць кіем лупі. Але цяпер ня тое.. прайшлі тые часы... Бог ведае, пэўна што і ня вернуцца... Бывала, у нас было проста: стравы той, віна і інш. во! па самае горла.. Калі якое сьвята, ці справа, дык гулялі усей вёскай, усім обчэствам... Не было пагарды ні жабраку, ні хадзяку—усе былі роўные за сталом, усе былі свае. А цяпер?.. Эх, што цяпер — самі бачыце!..»

Праўда, раней шмат было дзічы і не мала грошы пакідалі прамыслоўцы золатам прыезджаўшые на Лену гуляць, ці спаць. Тады і тут селяне былі болей гасьціннымі: умелі садраць с такога пана і маглі самі развярнуцца на шырэйшую нагу, пылу у вочы пусьціць. А цяпер глядзяць ужо толькі якбы і з беднаго хадзяка садраць за начлег, самавар і інш., як з багатаго.

Ды ці варта казаць пра хадзяка-чужаніцу, калі чалдон і блізкаго сваяка не натта прыхільна прыймае. Калі прыежджае госьць, гаспадар ня выбяжыць к яму на сустрэчу, ня выпражыць каня, не прывітае хлебам-соляй а сядзіць сабе на гопчыку, пыхкаіць люльку, цыркае праз зубы на падлогу і чэкае, пакуль той не зойдзе у хату і не павітаіцца. Тады гаспадар цыркнуўшы йшчэ раз на зямлю працэдзіць ня рупна праз цыбук: «праходзіць пара»,—і ўзноў не ўзварухнуўшыся, не ўсьмяхнуўшыся пыхкае люльку і цыркае на зямлю. Толькі праз добрых паўгадзіны гаспадар пачынае варушыцца, нібы крыху ухмыляцца і аб тым ды сім пытацца. І—ўрэшці, пэўна ўжо разчуліўшыся, камандуе гаспадыні рыхтаваць на стол, сам-жэ пачынае з гасьцём частавацца махоркай.

Эдукація. Гэта пытаньне і тут ляжыць балючай ранай на сэрцы вяскоўца. На пытаньня: чаму ня вучыце дзяцей? заўсёды пачуіш атказ: «німа за што!» Толькі пасьля доўгай прамовы у гутарцы з імі у цябе выробіцца гэткае ўражэньне. «Школ хаця і многа за апошніе годы пабудаваў урад, але карысьці ад іх мала: бо вучуць там усяму і ўсё, ды ніколі таму, што найрупней трэба ведаць селяніну. Добра-б было — кажуць яны—каб апрыч граматы вучылі, як хадзіць каля зямлі, гадаваць жывёлу, вясьці гандаль с купцамі і як паляваць за птушкай і зьверам. Дзеля гэтаго і кніжкі павінны быць добра дапасаваны да селянскаго жыцьця і тым найболей—перша,—пачатковые: яны павінны тлумачыць аб жыцьці і прыродзі роднаго краю, а не аб тых хаця і болей культурных, але чужых і далёкіх краінах, бо без свайго чужое вучням мала зразумела...»

Аткажу толькі яшчэ на Вашэ пытаньне: «ці варта ехаць у Сібір?» Дык вось хаця Сібір і вялікая старана, хаця тут ёсьць розные мейсцы і розные людзі, дзе я

---

Што паможэ, калі мы ўсе пачнём гінуць тут, як ты? А цяпер я не бачу бяды—мне весела, бо і ўсім тут весела; я хачу сьпеваць і каб мог, то выскачыў-бы і пайшоў-бы ў прысядкі.

І дуб, каторы гаварыў гэта, пачаў ўздымаць то адным, то другім сукам, якбы і папраўдзі рыхтаваўся у прысядкі.

— Маладзец! маладзец! — падбадралі яго другіе дубэ:—от зрэзаў старога, дык зрэзаў! Што ён цяпер скажэ?

— А я скажу, што вы сьляпые, і ў сьлепаце сваёй вы шчаслівы. Я кажу не пра такіе неспадзевы. Гэта праўда, што шмат чаго мы не прачуем і не дабачым. Праўда і тое, што кожны час можа прынясьці нам згіноту. Нас можэ зсеч сякера людзкая, можэ які небудзь сапляк-пастушок выпаліць нашэ нутро... Штож? ўсё гэта бывае. Але зірніце вы трохі далей; гляньце на тую стужку бліскучэй вады, што так зграбна апіразвае стары лес. Я бліжэй стаю ад яе і больш бачу за вас. Усё дно яе выслалі дубовые трупы. Калісь то і яны былі здаровымі, крэпкімі, радаснымі. А дзе яны? Дзе нашы сябрукі, разложыстые тоўстые дубэ? Дзе той дуб-веліч, што заглядаўся на прыгожую рэчку і сьмеяўся над злосьцяй бур і вятроў? Зірніце вакруг — дзе яны? І ці ня гэтая самая доля чакае тут усіх нас?

Гэта была шчырая праўда. І змоўклі вясёлые дубэ, і вялікі сум агарнуў іх. Змоўклі радасные іх сьпевы-шэпты, і жудасна-жалабна шумелі іх верхавіны.

— На што ты адабраў ад іх радасьць, дуб-бацька? — спытаў старого дуба яго прыяцель, доўганосы бусел:—ці добра зрабіў ты, раскрыўшы ім вочы?

— Лепш быць нешчасным, але відушчым, ніж шчасьлівым, ды сьляпым,—атказаў дуб.

**Тарас Гушча.**

# СТАРЫ.

Стары. Ну калі так, дык слухайце-ж! Цяпер, як бачыце, я сівы, зморшчэны, як печэная бульба, але калісь дык быў папраўдзе ткі прыгожы, як каралевіч з дзіўнай казкі. І прызнаюся вам, што любіў я па вечарынках таптацца, ды дзеўчат зацікаўліваць. Замарочыш, закруціш ім, бывала, як авечкам, галовы, ходзюць пасалавеўшы, а я і рад с таго. Але так-сяк, туды-сюды, глядзіш, ажно іх «сталасьць знікае як дым». Я ужо пабялеў, ну а бабу хоцьбы вось столечкі, уцяміў. Цемра! Адно толькі ведаю, што прыгожая баба найдужэй за ўсіх і за ўсё,—гэта—шэры бог. Ну але я завёў непатрэбшчыну, а тым часам, што вы мне тут налілі? Рому! На здароўе! Гахх! Сустрэў я, бачыце раз саму красу: ядрэную, гордую, як львіца, дзяўчынку. Гм! Папрабую, думаю, шчасьця, аднакжэ мне шанцуе. І ці паверыце — апарыўся. З гонарам, дэлікатна яна мне апавесьціла, што прозвішчэ яе канчыцца на «скій», што кроў яе і яе прашчуроў блакітная, што рыцаркі век — гэта яе лятуценьне, асалода, што яна гідзіцца цяперашняго народніцтва, гэтай гразі, копаці, мешаніны. «І калі я бачу перад сабой гэтых грубых лапатнікоў, то шчыра сьмяюся с тых, што знай ходзюць у такіх перажытках нешта чалавечаго». Так закончыла яна. Ну й як вам падабаецца такі смурод? Я тросся як квашаніна са злосьці. Гэта мяне хапіла, як кажуць, за жывое і ня будзь таго сьмешнаго ўросшаго да дурнаты пераконаньня, што кабета слабей мужчыны, я-б ня вытрываў і заехаў-бы па яе павабных шчочках.

— Ну, а якжэ выйшла?

Стары. А выйшла так, што я надзеўшы авечую скурку, пакляўся адамсціць ёй. Хутке мы ужо хадзілі, як спарышы, па цёмных алеях, успамінаючы вялікіе учынкі слаўных рыцароў. І вось аднаго разу, калі я ёй, дурненькай, абецаў нешта такое рыцарскае, — толькі што—ужо ня помню, дык яна пазволіла сябе пацалаваць. Вось з гэтай хвіліны я пачаў мсціць. Я яе цалаваў сваімі вільготнымі вуснамі кожны дзень; я ей казаў што я патомак самых заплясьнелых, каравых хамоў, што я вечны вораг арыстакратоў, што рыцарство—гэта сьмяцьцё у жалезных чарапох. Нічога не памагло. «Я твая, я на век твая»,—хліпала яна, і сьлёзы цурком капіліся на высокіе грудзі. Я яе пагарджаў, ненавідзіў і разам с тым як шалёны цалаваў яе у вусны, зацаловываў да абамленьня і, калі раз з дзікай грубасьцяй упіўся у яе вусны, як рысамака, яна вырвалася ад мяне с крыкам: «Што ты? што гэта?» Дай сюды, сказаў я бяручы дрыжачую яе ручку, і плюнуў на далонь куском запекшэйся крыві. Ох!! вырвалася з болем у яе і, як сноп бухнулася воб-землю... (Пры апошніх словах голас старого задрыжэў і чыстые слязінкі лягли шэрымі плямамі на абрус).

— Сумна, сумна!..

— Нічога ужо не парадзіш...

— Охохохо!

Стары (выціраючы вочы). Кэ, кэ, кэ! Чаго гэта охаеце? Я заплакаў, бо галава саслабела ад хмелю, бо сэрцэ сьціснуло ад жалю, што, барані Божэ, ды была-б гэта праўда. Ну, стукнімося!..

**Л. Р.**

йшчэ ня быў, але не раю ехаць' не раю родную Матку меняць на мачыху! Бо нудна, жыць у чужыне! Ды і не так ужо лёгка на новым мейсцы с паміж чужых людзей, а мо' і ў глухой тайзі аснаваць гаспадарку. Дзеля таго, каб новаму хлебаробу на новым і не пачатым мейсцы на карчох і карэньнях аснаваць і развіць хлебаробство, патрэбуюцца дзесяткі гадоў дзеля заможнай, вялікай і крэпкай сям'і. Ну, а нядужые адзінокіе і к таму-ж бедные лепей і не кратайціся: вы у сто раз атрымаіце болей карысьці для гаспадаркі і уцехі для сэрца, калі тые грошы і тую працу, што прыдзіцца затраціць на чужой старане паложыце дома. Аб гэтым гучна і праўдзіва у сваіх вершах прамовіў Я. Купала:

«Ты ўсё знайдзіш гэто блізка
Там, дзе маці над калыскай—
Табе песьні напевала,
Як малога калыхала,
Толькі ўмей шукаці бліска...»

**Янка Усціновіч.**

*С. Віцім, Іркуцк. г. 1 жніўня 1914 г.*

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Ад Віленскаго губэрнатара.** С прычыны вялікаго наплыву на почтах пісем у чужаземскіх мовах і недахвату часу у ваенных цэнзороў, віленскі губэрнатар звертаецца да жыхароў карыстацца па магчымасьці у сваіх пісьмах гасударственай мовай.

**Абавязываючай пастановай,** выданай да жыхароў двінскаго ваеннаго укругу забараняецца, пад карай да 3,000 руб. або 3 месяцы арышту, скупліваць медзь як у сырым відзе, так і вырабы з яе.

**Высылка.** Надовічы абавязываючай пастановай віленскаго губэрнатора загадано усім пражываючым у віленскай губэрні нямецкім, аўстрыяцкім і турэцкім падданым бяз розніцы веры і мужчыны ці кабеты у двухтыднёвы тэрмін з дня апавешчэньня гэтай пастанобы выехаць з граніц Расейскай Дзержавы.

Такім чынам належыць да высылкі з Вільні чужаземных падданых каля 500 душ і каля 100 пражываючых у віленск. губ.

**Новы лазарэт.** Гэтымі днямі віленскі дамскі камітэт Чырвонаго Крыжу аткрывае у Вільні другі шпіталь на 300 ложак для раненых і хворых ваякоў.

**Аб атпусканых на папраўку.** Віленскі паветовы ваенны начальнік паведоміў віленскаго паліцмэйстра, што запасные і ратнікі апалчэньня, увольненые с прычыны хваробы на даўжэйшы отпуск, лічуцца як на ваеннай службе і, калі скончыцца іх отпуск, павінны яўляцца к належачаму ваеннаму начальніку для асьведчэньня іх здароўя ў ваенным прысустві. У часе прабываньня у отпуску такіе асобы могуць паступаць куды падабаецца на службу, але толькі пакуль скончыцца тэрмін отпуску, пасьля якога, ў разе прызнаньня іх годнымі к ваеннай службе, павінны быць атпраўлены у сваю часьць.

**Ткацкі інструктар.** Пры віленскім сельска-гаспадарскім таварыстве, каб падняць ткацкі промысл у краю, уцьверджэны кіраўнік (інструктар) ткацкаго штукарства.

**Кары сьмерцяй.** Віленскі ваенна-акружны суд зясудзіў на кару сьмерцяй селяніна з вітэбск. губ., Крэйфа, за падпал лясьніковай хаты у тым часі, калі ўжо ў даным мейсцы было абвешчано ваеннае палажэньне. — Гэты-ж самы суд засудзіў на кару сьмерцяй С. Дзерко, родам с-пад Варшавы, за збройны напад у Варшаві на нейкаго Бучарова і аграбленьне у яго 1000 руб. Іншые учасьнікі гэтаго нападу ня выкрыты.

## З Міншчыны.

**Добры учынак.** У дварэ Бабоўні, слуцк. пав., у часі Каляд заместа святочнай, як даўней, пачосткі слугі атрымалі ад гаспадыні двара п. І. Трусколяскай 20 р., каторые у свой чарод ахвяравалі пацярпеўшым ад вайны польскім селянам. Гэта самае зрабіў і суседнім двары Адамовічы жыд Хаім: ён на гэты цэль аддаў усе свае 8 руб., якіе меў пры сабе.

**Пажар.** У м. Новы Барысаў спалілася часьць шкляной гуты «Барысаў», якая належыць да т-ва братоў Краеўскіх. Страты 50,000 руб.

Толькі надовічы шчыры супрацоўнік а патчас і заступнік рэдактара тазэты «Мінская русская газета Сѣверо-Западная Жизнь» нехта Міхальскій (Щипалко) удасужыўся перайці з нямецкаго падданства у расейскае.

## З Вітэбшчыны.

**Вітэбскае паветовае земство** хлапочыць перэд губэрскім аб тым, каб яно выпрацавало і правяло ў жыцьцё: 1) праект цэлаго раду народных дамоў у вітэбскай губ., маючы на відавоку мейсцы з закрываючыміся казёнкамі; 2) аткрыло на рахунак губэрскаго земства цэнтральны для паветоў сваей губэрні склад сьветляных малюнкоў, тасьмаў для школьных сінематографоў і агулам прылад для паказываньня жывых малюнкоў і народных лекцій; 3) пасталалося аб наладжэньні стасоўных курсоў для падгатоўкі лектороў (умеючых чытаць навучные лекцii), якіе маглі-бы наладжываць дзе трэба вотчыты, вясьці курсы для ўзрослых і паўторные заняцьця навукай с падросткамі і інш.

**Цьвярозасьць.** Павэдлуг апошніх вылічэньняў выпадкі убіўстоў за другое паўгоду 1914 г., у часе закрыцьця шынкоўняў, зьмешыліся, калі параўняць з другім паўгодам 1913 г., болей чым на палавіну.

---

У **Гомэльскім** пав., магіл. губ., к 1 студню 1915 г. было 13 бравароў, 670 ветраных млыноў, 13 вадзяных млыноў, 45 фабрык масла, 43 цагельні, 70 кузьняў, 425 таргowых крам, 8 гарбарняў.

**Падарожа на ваўку.** У гомэльскім пав., Могіл. губ., не падалёк ад жалезнадарожнай будкі Палескай чыгункі на прахадзячаго па лініі работніка Е. Палавінку, 20 год, напаў воўк і пачаў кусаць яго за ногі. Палавінка схапіў ваўка за ляпу, сеў яму на грыбет і гэткім манерам даехаў да будкі. На крык ездака выскачыў яго бацька Р. Палавінко і задушыў ваўка, усадзіўшы яму ў ляпы жэрдку. Е. Палавінку воўк пакусаў ногі і рукі.

У **Гродну** надовічы вярнуліся вывезеные да часу с прычыны вайны прысутственые установы і пачалі сваю працу.

У **Шаўлях**, ковенск. губ., аткрылася школа ткацтва (вул. Зубова). Навука трывае 2 гады, дармавая.

# З усіх старон.

**Аб ваеннай павіннасьці.** Ваеннае міністэрство пастанавіло асвабадзіць ад прызыву рабочых, каторые працуюць на заводах належачых да ваеннаго і марскога міністэрстваў. Калі-ж рабочы выступіць з заводу, то траціць на гэта ільготу.

**Грошы на хлеб.** Рада міністраў пазволіла прадажу хлеба по сваёй цане і на выплату, а таксама выдачу грошы, як помач на харчы гарадзкім і вясковым жахаром Польшчы ды Гродзенскай і Ковенскай губэрняў.

**Здарэньне у Петраградзкім судзе.** У Петраградзкай судовай палаці быў гэткі выпадак. Павінен быў стаць пад прысягу нейкі Баулін, каторы сказаў, што прысягаць ня можэ, бо лічыць сябе безрэлігійным, і прасіў ужо у Сынодзі, каб яго адлучылі ад праваслаўя. Прэдседацель суду паясьніў, што пакуль не мае яшчэ атказу на сваю просьбу ад Сыноду, дык павінен даваць прысягу перад сьвяшчэнікам. Сьвяшчэнік Васільеў пачаў чытаць словы прысягі; раптам бацюшка стаў крычаць «на калені!» і вырваў з рук у сьведкі шапку. Баулін пакорна укленчыў. Нездаволены, як відаць, яшчэ з гэтаго бацюшка не перэставаў крычаць на сьведку. Тут прэдседацель заявіў пярорву. Свяшч. Васільеў давай тады крычаць і на прэдседацеля: Як вы сьмееце перашкаджаць мне у маіх абавязках! а пасьля дадаў: вон ад гэтуль швабы. А прэдседацель меў нямецкую фамілію, Зэйфэрт. Зараз заседаньне прорвано. Аб выпадку тэлеграмай паведамілі Міністра права. Як заседаньне адкрылоса для прысягі прызвалі ўжо другога бацюшку.

**Арышт прыяцеля Льва Толстого.** Надовічы з Яснай Паляны вызвалі у Тулу і там арыштавалі прыяцеля Льва Толстога, Д-ра Макавецкаго, каторы лячыў вялікаго пісьменніка праз апошніе 6 гадоў і быў пры ім да сьмерці. Арышт Макавецкаго мае супольнае са справай, за каторую арыштованы сэкрэтар Толстого, Булгаков.

**Кары на газэты.** Ў 1914 г. на газэты у губэрнях Прыбалційскаго краю наложэны гэткіе кары: 21 газэт літоўскіх былі абложэны штрафамі 71 разоў, разам на суму 6,650 руб. з заменай на 136 месяцоў арышту; 1 газэта літоўская «Vilnis» была штрафавана 7 разоў на суму 2,000 р. ці 17 месяцоў арышту; 5 газэт эстонскіх—8 разоў на 1,800 р. ці 14 мес. арышту; 1 газэта нямецкая — 200 р. ці 2 мес. арышту; 2 газэты расейскіе— 500 руб. ці 5 мес. арышту. Разам за ўвесь год аштрафована 30 газэт, 89 разоў на суму 21,150 руб. ці 14 с паловай гадоў арышту.

**На Каўказе ня можна гаварыць па нямецку.** Пішуць с Тыфлісу, што генерал-губэрнатар Вольскій выдаў загад забараняючый гаварыць на вуліцах і у публічных мейсцох па нямецку. Правінаваціўшыеся ў гэтым штрафуюцца да 3000 р. ці 3 мес. арышту.

**За гутарку па нямецку** на вуліцы у Петроградзі аштрафаваны на 1000 руб. адвакат з Вэндэня, ліфляндзкай губ. Гвідо фон-Іервальд.

**За абгавор.** Петраградзкі акружны суд прысудзіў рэдактара «Нов. Вр.» Суворына на 2 месяцы турмы за абгавор чыноўніка міністэрства гаспадаркі Андрэева, у карэспандэнціі з Усьцюжны Ноўгародзк. губ.

**Сэквэстр.** 21 студня па загаду Кіеўскай адміністрацыі сэквэстрована (узята на апеку казны) маентнасьць Т-ва Сімэнс і Гальске.

**300 народных дамоў.** Палтаўскае губэрскае земскае сабраньне пастанавіло старацца аб забароне на заўсёды прадажы гарэлкі ў губэрні. А каб народ мог разумна каратаць час—адкрыць 300 народных дамоў.

**Мэтрапаліт Шэптыцкі** як паведамляець «Нов. Вр.» стараўся, каб яму было пазволена жыць у Петраградзі, але гэту просьбу яго ўласьці не ўважылі, прызнаўшы, што гэта не на часе.

**Забарона лекцій.** Па загаду маскоўскаго градоначальніка забаронена вядомаму расейскаму паэту Брюсову і журналісту Філатову, каторые вярнуліся с тэатру вайны, прачытаць лекціі аб вайне.

**Атруцьця хлёраформам.** 19 студня на ст. Вологда, Паўночных чыгунак арыштанты пры перэпакоўцы тавароў, дарваўшыся да хлёраформу, залішне яго выпілі заместа гарэлкі. 20 арыштантоў звалілося бяз чуцьця на зямлю. Прывезеные у шпіталь 2 з іх памёрлі, а рэшту удалося адратаваць.

**Праз кабету-адвакатку.** У Маскве атрыманы указ Сэнату, у каторым абвешчаецца выгавар міравому судзьдзі Сілову, за тое, што ён пазволіў бараніць справу кабеці—адвакатцы Коновніцэр, каторая скончыла Маскоўскі унівэрсытэт.

У **Польшчы.** Варшаўскі генерал-губэрнатар загадаў, каб тамтэйшые купцы да 26 студня паведамілі у паліцейскіе вучасткі, сколькі кожны купец маець на складзі найпатрэбнейшых прадуктоў. — Надовічы усе поезды, што ходзюць паміж Жырардовам а Варшавай, і прызначэные для пасажыроў, прывязьлі у Варшаву колькісот жыдоўскіх сем'яў з Жырардова, Мшчонова і Віскітак, гдзе ўласьці загадалі, каб усе жыхарыжыды пакінулі гэтые мейсцы ў працягу 12 гадзін. — Фабрычные склады у Жырардові па загаду ўласьцяў запечатаваны і тавары, што ў гэтых складах знайходзюцца, чэпаць ня можна. Склады гэтые перад вайной мелі тавароў на колькі мільёноў рублёў. Часьць тавароў ваенные ўласьці рэквізавалі. — 15 студня кружыўся над Варшавай нямецкі аэроплан і кінуў бомбу, каторая ўзарвалася, не прычыніўшы нікому шкоды. Расейскіе самалёты прагналі праціўніка.—За апошніе 6 месяцоў агулам атруцілося у Варшаві дэнатурованым спіртам 100 людзей.

У **Галіччыні.** З Галіччыны у Кіеў дастаўлена новая парція затрыманых у заваеваным краю асоб, высыланых адміністраціўным парадкам далей у томскую губэрню. —У нарымскі край прыехалі с - сланые туды прэдстаўнікі букавінскай ўласьці — чэрнавіцкі віцэ-губэрнатар В. Дулінкевіч, пракурор чэрнавіцкаго суду Л. Норбэрг, дэпутат рэйхсрата (як расейская Дума) Н. Спінуль, бургомістр гор. Чэрновіц С. Вайсэльбэргэр і адвакат Ф. Мэцэн.—У Запытоўцы, львоўскаго павету, аткрыта першае ў Галіччыні расейскае сельскае пачатковае вучылішчэ. У скорым часі будуць аткрыты ў розных пунктах краю яшчэ чатыры такіе вучылішчы. — Дачэсны ваенны генерал-губэрнатар Галіччыны гр. Бобрынскій атрымаў награду ордэр Анны 1 клясы.

Рэдактар-Выдавец

**І. Луцэвіч.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.